ПРОЕКТНАЯ ДЕКЛАРАЦИЯ

объекта «Группа многоквартирных жилых домов со встроенными помещениями общественного назначения для обслуживания населения по ул. Олешева со сносом административных, производственных, складских зданий и сооружений по ул. Олешева, 5»

Жилой дом № 1 по генплану

ДОЛЕВОЕ СТРОИТЕЛЬСТВО НА КОММЕРЧЕСКОЙ ОСНОВЕ

ИНФОРМАЦИЯ О ЗАСТРОЙЩИКЕ:

Закрытое акционерное общество «Совавто Инвест»; место нахождения: г. Минск, ул. Сурганова, дом 61, помещение 81; режим работы: с 09.00 до 17.30. Обеденный перерыв: с 13.00 до 13.30. Выходные дни: суббота и воскресенье. Общество зарегистрировано в Едином государственном регистре юридических лиц и индивидуальных предпринимателей 28.03.2011 за № 191445853.

Застройщик принимал участие в строительстве жилых домов:

- № 3 по генплану в составе объекта «Группа многоквартирных жилых домов со встроенными помещениями общественного назначения для облуживания населения по ул. Олешева со сносом административных, производственных, складских зданий и сооружений по ул. Олешева, 5». Фактические сроки строительства жилого дома № 3 по генплану: 07.12.2015—13.07.2016;

- № 2 по генплану в составе объекта «Группа многоквартирных жилых домов со встроенными помещениями общественного назначения для облуживания населения по ул. Олешева со сносом административных, производственных, складских зданий и сооружений по ул. Олешева, 5». Фактические сроки строительства жилого дома № 2 по генплану: 18.05.2016—30.06.2017.

ИНФОРМАЦИЯ ОБ ОБЪЕКТЕ СТРОИТЕЛЬСТВА:

1. Цели строительства: **возведение многоквартирного жилого дома**; этапы и сроки реализации: **возведение в один этап в срок по 10.11.2017**; получены положительные заключения государственной экспертизы **от 27.08.2013 № 568-60/13, от 25.02.2016 № 1099-60/15, от 07.07.2016 № 574-60/16**.

2. Сведения о месте нахождения объекта строительства и его характеристики, в том числе сведения о количестве объектов долевого строительства, предлагаемых для заключения договоров, сведения о ценах на объекты долевого строительства и условия их возможного изменения застройщиком в одностороннем порядке: **9-подъездный 10-этажный крупнопанельный 320-квартирный жилой дом № 1 по генплану в изделиях серии М464-10-У по ул. Олешева в г. Минске.**

Для заключения договоров создания объектов долевого строительства предлагаются следующие квартиры по указанным ниже ценам:

Тип квартиры	Площадь по СНБ (м кв.)	Стоимость 1 кв. м* в долларах США**	Цена объекта долевого строительства в долларах США**	Количество квартир	Номера квартир
3к-36	80,85	1 000	80 850	1	179
3к-37*	75,92	1 000	75 920	1	182
3к-14*	79,70	1 000	79 700	7	186, 190, 194, 198, 202, 206, 210
1к-18	39,92	1 100	43 912	1	180
1к-2	39,99	1 100	43 989	7	183, 187, 195, 199, 203, 207, 211
2к-27*	59,01	1 100	64 911	1	181
1к-18	39,92	1 100	43 912	8	184,188, 192, 196, 200, 204, 208, 212
ИТОГО для заключения договоров долевого строительства предлагаются				**26 квартир**	

**** Действует система скидок.***

***** Оплата производится в белорусских рублях по официальному курсу, установленному Нацбанком на дату платежа по договору.***

Цена объекта долевого строительства может быть изменена застройщиком в одностороннем порядке в случае нарушения дольщиком срока оплаты и (или) размера платежей по договору создания объекта долевого строительства вне зависимости от периода просрочки платежа и/или размера несвоевременно внесенного платежа.

3. Информация о решении местного исполнительного и распорядительного органа о процентном соотношении в строящемся объекте граждан, состоящих на учете нуждающихся в улучшении жилищных условий (при наличии такой информации): нет.

4. Данные о правах застройщика на земельный участок, его площади: право временного пользования в отношении земельного участка с кадастровым номером 500000000008001883, расположенного по адресу: г. Минск, ул. Олешева, 5, площадью 2,5974 га.

Границы земельного участка: ограничен с севера красными линиями ул. Олешева; с востока территорией существующего жилого дома ТС «Логойское» и строящегося дома ОДО «ОлКи»; с юга территорией существующей группой жилых домов ОАО «ДСТ-5»; с запада пешеходным тротуаром вдоль ул. Восточной.

Данные об элементах благоустройства: **организация подъездов, проездов и парковок; формирование сети пешеходных тротуаров и дорожек; устройство детских площадок, площадок для отдыха взрослого населения и площадки для хозяйственных нужд; озеленение территории; оборудование территории малыми архитектурными формами.**

5. Сведения о количестве в строящемся жилом доме самостоятельных частей, передаваемых застройщиком дольщикам после утверждения в установленном порядке акта приемки в эксплуатацию жилого дома и иных объектов недвижимости: **26 квартир.**

6. Сведения о функциональном назначении нежилых помещений в многоквартирном жилом доме, не входящих в состав общего имущества многоквартирного жилого дома: **19 административных помещений.**

7. Сведения о составе общего имущества многоквартирного жилого дома, которое будет находиться в общей долевой собственности дольщиков после приемки в эксплуатацию многоквартирного жилого дома и передачи объектов долевого строительства дольщикам: **межквартирные лестничные клетки, лестницы, лифты, лифтовые и иные шахты, крыши, технические этажи и подвалы, другие места общего пользования, несущие, ограждающие ненесущие конструкции, механическое, электрическое, сантехническое и иное оборудование, находящееся за пределами или внутри жилых и (или) нежилых помещений, элементы озеленения и благоустройства.**

8. Сведения о предполагаемом сроке приемки в эксплуатацию строящегосяся жилого дома: **10.11.2017.**

9. Сведения о договорах строительного подряда, заключенных застройщиком (при их наличии), и порядке ознакомления застройщиком дольщиков с объектом долевого строительства и ходом работ по его строительству: **договор строительного генподряда от 24.05.2016 № 39/05-16, заключенный застройщиком с ОАО «МАПИД».** Дольщики вправе ознакомиться с объектом долевого строительства и ходом работ по его строительству по согласованию с Застройщиком в установленное им время и в присутствии его уполномоченного представителя с соблюдением правил и техники безопасности. **Уполномоченный представитель Застройщика: ООО «Сильван» (г. Минск, ул. Я. Купалы, д. 17/30; тел. 8 017 222 38 32, 8 017 222 38 17). Инженерная организация: ООО «ИНТЕХНОСТРОЙ».**

■ Гісторыя ў рэчах

Рэтра-трактары і 5D-сімулятар

Якім быць новаму музею МТЗ?

Загадчык музея Аміня БАЙТАСАВА і «Залаты Меркурый».

НЯДАЎНА Мінскі трактарны завод пачаў прапаноўваць незвычайную паслугу — любы ахвотны можа за 9 рублёў паўдзельнічаць у зборцы легендарнага беларускага трактара. Першымі «работнікамі на дзень» сталі пяць чалавек: два беларусы, два швейцарцы і амерыканец, якія выканалі пяць аперацый на канвееры пад кантролем спецыялістаў. Гэта толькі адна з ідэй, якія прадпрыемства рэалізоўвае ў сферы прамысловага турызму. Найбольш амбіцыйная — стварэнне ўласнага музея, праца ў гэтым кірунку ўжо вядзецца. Карэспандэнты «Звязды» завіталі на МТЗ і даведаліся, што ён будзе з сябе ўяўляць.

Работа ў былым памяшканні завадской пральні, куды ў ранейшыя часы жыхары Трактаразаводскага пасёлка прыходзілі працы рэчы, ідзе поўным ходам. Ужо працуе «рэцэпцыя» будучага музея — раней тут быў гардэроб, а цяпер можна набыць шматлікія сувеніры: футболкі з прынтамі трактароў, кубкі, ручкі, статуэткі. У хуткім часе ў продажы з'явяцца і білеты ў сам музей — у суседнім вялікім памяшканні рабочыя шчыруюць бесперапынна. А ў складское памяшканне ў кардонных каробках паступова пераносяць будучыя экспанаты, карпатліва сабраныя па розных цэхах і адміністрацыйных будынках.

— Вядома, музей у нашага завода быў і раней, — расказвае **загадчык будучай установы Аміня БАЙТАСАВА.** — У 1971 годзе да 25-годдзя з дня стварэння прадпрыемства ў Палацы культуры МТЗ адкрылі невялікую экспазіцыю, прысвечаную гісторыі завода. Большая частка экспанатаў адтуль цяпер «перакачавала» да нас. У 2006 годзе былі планы па мадэрнізацыі музея, але атрымалася дакладна наадварот — старую ўстанову закрылі, а экспанаты раз'ехаліся па цэхах, упраўленнях і аддзелах. Але цяпер пытанне стала зноў актуальным, бо мы, па-першае, працуем над сваім іміджам, а па-другое, развіваем кірунак прамысловага турызму.

Сам музей будзе складацца з некалькіх комплексаў. На адкрытай пляцоўцы перад уваходам размесцяцца самыя легендарныя мадэлі трактароў. Рарытэтныя машыны ўжо збіраюць па ўсёй краіне (нядаўна, напрыклад, у адной з гаспадарак выкупілі двухмільённы трактар, выпушчаны на заводзе) і даводзяць да ладу — усё павінна быць у працоўным стане. «Першапраходцы» МТЗ-2, МТЗ-5 і МТЗ-7, МТЗ-50, што асвойваў цалінныя землі Казахстана, легендарны МТЗ-80, які выпускаецца і сёння, — за рулём кожнага з гэтых трактароў змогуць пасядзець наведвальнікі будучага музея.

У першай частцы экспазіцыі раскажуць пра гісторыю станаўлення прадпрыемства: узвядзенне завода пасля вайны, прасоўванне прадукцыі ў тыя далёкія часы, медалі і ўзнагароды МТЗ. Так, у Мінскага трактарнага завода ёсць цэлы шэраг ордэнаў, пра якія ведаюць многія: Леніна, Кастрычніцкай рэвалюцыі і іншыя. Але некаторыя ўзнагароды інакш як унікальнымі не назавеш. Напрыклад, мангольскі ордэн Палярнай зоркі — яго прысуджалі тым, хто дабіўся поспехаў у справе ўмацавання абараназдольнасці Мангольскай Рэспублікі, развіцці народнай гаспадаркі, культуры або аховы здароўя. Узнагароду пад нумарам 24 667 МТЗ атрымаў за тое, што з 1971 па 1985 гады выпусціў для гэтай краіны больш як 300 тысяч трактароў «Беларус» — лічба без перабольшання фантастычная. У асноўным гэта былі тыя самыя МТЗ-80.

Экзэмпляр першага серыйнага трактара МТЗ-2 ужо ўпрыгожвае завадскі сквер. А ў новым музеі для рэтра-машын створаць цэлую асобную пляцоўку.

Загадчыца музея дэманструе і так званы «Залаты Меркурый» — статуэтку, якой узнагароджваліся сусветныя лідары, персоны і кампаніі, якія зрабілі вялікі ўнёсак у развіццё грамадства і рашэнне важных праблем. У ліку адзначаных прызам знаходзяцца, напрыклад, колішні прэзідэнт Францыі Жорж Пампіду, прэзідэнты ЗША Джэральд Форд і Рональд Рэйган, генеральны сакратар ЦК КПСС Леанід Брэжнеў і многія іншыя. МТЗ статуэтку атрымаў у 1980 годзе разам з такімі прадпрыемствамі, як Волжскі і Горкаўскі аўтамабільныя заводы, Харкаўскі авіяцыйны завод, рыжскі завод ВЭФ.

— Другой важнай часткай экспазіцыі стане зала «Гісторыя МТЗ у асобах», — каментуе Аміня Байтасава. — Тут мы раскажам гісторыі ўсіх дырэктараў, галоўных канструктараў і інжынераў прадпрыемства, Герояў Сацыялістычнай Працы, воінаў-інтэрнацыяналістаў.

Той самы ордэн Палярнай зоркі — адна з малавядомых узнагарод прадпрыемства.

Асобнае месца зоймуць гісторыі працоўных дынастый. Многія з іх вельмі павучальныя, гэта дапаможа нам захоўваць карпарацыйныя традыцыі.

Наступны раздзел будзе мець назву «МТЗ — гораду і краіне». Тут наведвальнікам пакажуць, што прадпрыемства дало іншым людзям: якія будынкі былі ўзведзены дзякуючы Мінскаму трактарнаму, для якіх ініцыятыў завод стаў спонсарам... Згадаюць сярод іншага і гісторыю Трактаразаводскага пасёлка, якому цяпер пагражае знікненне. На думку стваральнікаў музея, гэта быў унікальны праект, калі разам з прадпрыемствам ствараўся цэлы раён з уласнай інфраструктурай. У холе размесцяць некалькі яго фотаздымкаў, датаваных часам росквіту — 60 гадамі мінулага стагоддзя.

Асобна раскажуць пра тое, што МТЗ даў усяму свету. Тут размесціцца карта, на якой схематычна пакажуць рынкі збыту прадукцыі (цяпер — 138 краін), адзначаць партнёраў завода, паведамяць, дзе нашы спецыялісты займаюцца навучаннем замежнікаў. Апроч гэтага, у музеі ўсталююць спецыяльны 5D-сімулятар, на якім кожны ахвотны зможа ў віртуальнай рэальнасці адчуць сябе кіроўцам легендарнага «Беларуса». Больш за тое — за камп'ютарам можна будзе нават сканструяваць уласны трактар: распрацаваць мадэль, «выпусціць» дэталі і сабраць машыну.

— Канцэпцыя яшчэ можа змяняцца, мы ствараем і адначасова імправізуем, — кажа загадчыца. — Многія супрацоўнікі самі прыходзяць да нас са сваімі ідэямі, мы іх абавязкова абмяркоўваем, прымаем да ўвагі. Таму музей стане вынікам калектыўнай працы ўсяго прадпрыемства.

Хто ж стане асноўнымі наведвальнікамі экспазіцыі? На думку Аміні Байтасавай, гэта ў першую чаргу будуць школьнікі з усёй Беларусі. Для вучняў 1—5 класаў тут збіраюцца праводзіць спецыяльныя музейныя заняткі. Яны будуць уяўляць з сябе своеасаблівыя «ўрокі», разлічаныя на 45 хвілін, якія будуць праходзіць у гульнявой форме, бо звычайныя экскурсіі дзяцей не вельмі захапляюць. Юным наведвальнікам дапамогуць разабрацца ва ўстройстве трактара, прычым абяцаюць, што дэталі машын можна будзе патрымаць у руках, убачыць прынцып іх работы. Менавіта самыя малодшыя будуць зацікаўлены згаданым вышэй пакоем віртуальных гульняў. На прадпрыемстве не хаваюць, што хацелі б такім чынам зацікавіць дзяцей працай на МТЗ і ўвогуле ў сферы машынабудавання.

Чакаюць тут і студэнтаў, і навучэнцаў, пераважна профільных устаноў: Мінскага дзяржаўнага машынабудаўнічага каледжа, аўтатрактарнага факультэта Беларускага нацыянальнага тэхнічнага ўніверсітэта, Беларускага дзяржаўнага тэхналагічнага ўніверсітэта. Ды і простых жыхароў сталіцы музей можа зацікавіць, бо менавіта ў гісторыі трактарнага завода ў многім увасабляецца пасляваенны лёс горада. Не на апошніх месцах будуць і замежнікі, у тым ліку ганаровыя госці.

— Я думаю, што ўжо ў верасні мы адкрыемся для наведвальнікаў — хутчэй за ўсё, да Дня машынабудаўніка, — кажа Аміня Байтасава. — Вядома, спачатку толькі часткова, а ўжо потым у працэсе будзем дапаўняць экспазіцыю, магчыма, нешта змяняць. Думаю, што далей будзем праводзіць і тэматычныя выстаўкі.

Яраслаў ЛЫСКАВЕЦ.

lyskavets@zviazda.by

Фота Сяргея НІКАНОВІЧА